ГРОДЗЕНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
пл. Леніна, 2/1, 230023, г. Гродна
тэл. (0152) 62 64 66, факс 62 49 35
эл. пошта: info@grod.grodno.by

ГРОДНЕНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
пл. Ленина, 2/1, 230023, г. Гродно
тел. (0152) 62 64 66, факс 62 49 35
эл. почта: info@gorod.grodno.by


29.11.2024 № 10-08/Ж-341/Э
На № ____________ ад ____________

[redacted]

Аб разглядзе зварота

Гродзенскі гарадскі выканаўчы камітэт, разгледзеўшы Ваш зварот аб прапанове ўшанавання памяці Васіля Быкава шляхам стварэння ў г. Гродна мемарыяльнай шыльды, паведамляе наступнае.

Стварэнне і ўстаноўка твораў манументальнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь рэгламентуюцца Палажэннем аб парадку стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэррыторыі Рэспублікі Беларусь, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2008 г. № 1372 (у рэдакцыі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2022 г. № 26).

Разліковымі паказчыкамі па г. Гродна не прадугледжана фінансаванне расходаў на стварэнне аб’ектаў манументальнага мастацтва ў горадзе, у тым ліку стварэнне мемарыяльнай або памятнай шыльды ў памяць Васіля Быкава. У сувязі з адсутнасцю дадатковых крыніц фінансавання, прадугледзець сродкі на вышэйназваныя мэты не ўяўляецца магчымым.

Дадаткова паведамляем, што ў студзені 2023 г. у літаратурным аддзеле УК “Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей” (былы музей Максіма Багдановіча) была значна пашырана экспазіцыя, прысвечаная Васілю Быкаву, на якой экспануюцца ў тым ліку асабістыя рэчы пісьменніка.

Дзякуем за актыўную жыццёвую пазіцыю і ўнесеныя прапановы.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. “Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб” Вы маеце права абскардзіць дадзены адказ у вышэйстаячую інстанцыю – Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт (г. Гродна, вул. Ажэшкі, 3).

Намеснік старшыні З.В.Кулеша

Чарняк 62 60 04
Апановіч 62 69 60